**Назва вучэбнай дысцыпліны:**
**“Тэорыя літаратуры”**

| | |
|---|---|
| **Код і найменне спецыяльнасці** | 1-02 03 01 Беларуская мова і літаратура |
| **Курс навучання** | 4 |
| **Семестр навучання** | 7 |
| **Колькасць аўдыторных гадзін:** | 48 |
| **Лекцыі** | 24 |
| **Семінарскія заняткі** | |
| **Практычныя заняткі** | 24 |
| **Лабараторныя заняткі** | |
| **Форма прамежкавай атэстацыі (*залік/ дыферэнцыраваны залік/экзамен)*** | экзамен |
| **Колькасць заліковых адзінак** | 3 |
| **Кампетэнцыі, якія фарміруюцца** | СК-1. Валодаць сістэмай лінгвістычных ведаў пра стылістычны патэнцыял фанетычных, лексічных, граматычных, дыскурсіўна-тэкставых парадыгмаў беларускай мовы, яе функцыянальна-стылістычных і стылявых разнавіднасцяў. |

**Кароткі змест вучэбнай дысцыпліны:**

Вучэбная дысцыпліна “Тэорыя літаратуры” скіравана на стварэнне неабходнай асновы для засваення студэнтамі літаратуразнаўчых дысцыплін. У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт атрымлівае веды пра эстэтычную і сацыяльна-гістарычную прыроду літаратуры і творчага працэсу, асноўныя гістарычныя этапы развіцця тэарэтыка-літаратурнай думкі, літаратуразнаўчыя школы, катэгорыі літаратурнага працэсу, асноўныя кампаненты мастацкага твора, спецыфіку вобразнасці ў мастацтве слова, рода-відавую спецыфіку мастацкай літаратуры; сутнасць і сферы выкарыстання агульнаэстэтычных і літаратуразнаўчых катэгорый, тэрмінаў, паняццяў, іх тыпалагічныя параметры; шляхі і галоўныя этапы развіцця сусветнай літаратуры (ад старажытнасці і да нашых дзен); асаблівасці літаратурнага працэсу на Беларусі, месца нацыянальнага мастацтва слова ў сістэме сусветнай літаратуры; узаемасувязь светапогляду і творчасці пісьменніка, асаблівасці яго стылю ці творчай манеры; канкрэтна-гістарычнае, агульначалавечае і нацыянальнае значэнне мастацкіх напрамкаў, твораў іх самых яркіх прадстаўнікоў; асноўныя прынцыпы і падыходы да літаратуразнаўчага аналізу тэксту.